Вячэрскі А.А.
БДЭУ, г. Мінск

# РОЛЯ СТРУКТУРЫ ЗНЕШНЯГА ГАНДЛЮ Ў АНАЛІЗЕ ПЕРСПЕКТЫЎ ВАЛЮТНАЙ ІНТЭГРАЦЫІ БЕЛАРУСІ І РАСІІ

Пры аналізе перспектыў валютнай інтэграцыі дзвюх або некалькіх краін важнейшую ролю набывае структура іх знешняга гандлю. Гэта звязана з тым, што знешні гандаль з'яўляецца адным з важнейшых перадатачных механізмаў асіметрычных шокаў у валютных саюзах. Таму пры падрыхтоўцы да стварэння валютнага саюза трэба асаблівую ўвагу звяртаць на набліжэнне структур знешняга гандлю краін, павышэнне ў ім долі высокатэхналагічных тавараў, а таксама долі ўнутрыгаліновага гандлю.

У першую чаргу трэба адзначыць, што для ўстойлівасці валютнага саюза патрабуецца не толькі высокая інтэнсіўнасць знешняга гандлю паміж краінамі, якая спрыяе выраўноўванню бізнес-цыклаў, але і высокая ступень ступень падабенства яго структуры. У гэтым выпадку верагоднасць асіметрычных уздзеянняў, якія перадаюцца па гэтым канале, падае, таму што краіны будуць у аднолькавай ступені схільны да ўплыву шокаў пры змяненні ўмоў гандлю.

Не ў апошнюю чаргу зніжэнне верагоднасці асіметрычных уздзеянняў забяспечваецца ўнутрыгаліновым гандлем. У сучасных умовах краіны часта экспартуюць і імпартуюць дыверсіфікаваную прадукцыю адной галіны, а таму пры шоках, якія будуць зыходзіць з гэтай галіны, страты нясуць усе краіны. Трэба адзначыць, што ўнутрыгаліновы гандаль найбольшае развіцце атрымаў у развітых краінах пры абмене высокатэхналагічнымі таварамі такіх галін, як машына- і аўтамабілебудаванне, хімічная прамысловасць і інш.

Вопыт іншых краін сведчыць аб тым, што знешні гандаль можа спрыяць асіметрычным уздзеянням на эканоміку, калі ў яго структуры пераважае прадукцыя з нізкай ступенню апрацоўкі. У гэтым выпадку экспарт краіны моцна залежыць ад стадыі бізнес-цыклу, на якой знаходзяцца партне ры. Як паказвае практыка, высокатэхналагічныя тавары ў меншай ступені залежаць ад замежнага попыту, а таму забяспечваюць стабільны рост экспарту.

Асабліва актуальнае значэнне аналіз структуры знешняга гандлю набывае для Беларусі ў сувязі з падрыхтоўкай да валютнай інтэграцыі з Расійскай Федерацыяй, нашым галоўным знешнеэканамічным партнерам.

Што датычыцца знешняга гандлю Расійскай Федэрацыі, трэба адзначыць, што ў структуры экспарту Расіі пераважаюць мінеральныя прадукты (57,7% у 2004 г.), а ў структуры імпарту – машыны, абсталяванне і транспартныя сродкі (41,2% у 2004 г.). Што датычыцца Рэспублікі Беларусь, доля мінеральных прадуктаў у экспарце з'яўляецца ўдвая ніжэйшай за расійскую (27,5% у 2004 г.), і высокай застаецца доля машын, абсталявання і транспартных сродкаў (22,2% у 2004 г.). У той жа час у імпарце доля машын, абсталявання і транспартных сродкаў удвая ніжэйшая за Расію (23% у 2004 г.), а вядучае месца займаюць мінеральныя прадукты (28,2% у 2004 г.) Трэба адзначыць, што пануючай тэндэнцыяй у знешнім гандлі Беларусі ў апошнія гады з'яўляецца рост долі прадуктаў нафтаперапрацоўкі ў экспарце. Тым не менш, улічваючы поўную залежнасць ад Расіі ў імпарце гэтай сыравіны, трэба адзначыць, што гэты рост носіць кан'юнктурны характар.

Аналіз структуры знешняга гандлю Расіі і Беларусі дазваляе зрабіць некалькі важных высноў:

1) Структуры знешняга гандлю нашых краін істотна адрозніваюцца;
2) Нізкая доля высокатэхналагічных тавараў у абедзвюх краінах сведчыць аб значнай залежнасці нашых краін ад сітуацыі на сусветных рынках;
3) Вялікі аб'ем экспарту мінеральных прадуктаў Расіяй выклікае рэвальвацыю расійскага рубля, што невыгадна нашай краіне, экспарт якой традыцыйна засноўваецца на прадукцыі перапрацоўчых галін вытворчасці.

Такім чынам, вышэйпрыведзеныя адрозненні ў структурах знешняга гандлю Беларусі і Расіі сведчаць аб тым, што верагоднасць асіметрычных шокаў, якія перадаюцца па каналах умоў гандлю, з'яўляецца вельмі высокай. У сучасных умовах валютная інтэграцыя Беларусі і Расіі з'яўляецца невыгаднай па прычыне магчымых значных страт для нашай краіны.

БДЭУ. Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт. Бібліятэка.



БГЭУ. Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.°.
BSEU. Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by elib@bseu.by